# ФАРМІРАВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ СТУДЭНТАЎ У ШТОДЗЁННАЙ ПРАЦЫ Ў ШКОЛЕ

Школа сутыкаецца са шматлікімі выклікамі. Яна павінна клапаціцца аб маладой асобе і падтрымліваць яе ў развіцці. Таксама яна павінна вучыць, тлумачыць, паказваць свет. Але адной з найбольш істотных задач з'яўляецца падрыхтоўка свядомых і адказных грамадзян, якія гатовыя ўдзельнічаць у жыцці грамадства.

**Сярод найбольш істотных кампетэнцый варта выдзяліць**:

• здольнасць да эфектыўнага ўзаемадзейяння з іншымі асобамі ў грамадстве,
• здольнасць да праяўлення салідарнасці і зацікаўленасці ў вырашэнні праблем, якія стаяць перад лакальнай і шырокай грамадскасцю,
• крытычная і творчая рэфлексія,
• канструктыўны ўдзел у дзейнасці лакальных і суседскіх грамадствах і ў працэсах прыняцця рашэнняў на ўсіх узроўнях, ад лакальнага праз нацыянальны да эўрапейскага , што найбольш датычыцца шляху галасавання,
• поўнае шанаванне правоў чалавека, у тым ліку роўнасці ў якасці асновы для дэмакратыі, пазнаванне і разуменне таго, як адрозніваць у сістэмах каштоўнасці розных рэлігійных і этнічных груп, што будзе ствараць фундамент для пазітыўнай асновы,
• адлюстраванне пачуцця прыналежнасці да сваёй уласнай мясцовасці, краіны, Эўропы ў цэлым і да ўсяго свету,
• гатоўнасць прымаць удзел у дэмакратычным працэсе прыняцця рашэнняў на ўсіх узроўнях,
• пачуццё абавязку,
• паказванне разумення і павагі да агульных каштоўнасцей, неабходных для забяспячэння згуртаванасці супольнасці,
• павага прынцыпаў дэмакратыі,
• канструктыўны ўдзел у грамадскім жыцці,
• грамадская дзейнасць,
• падтрымка разнастайнасці, сацыяльнай згуртаванасці і ўстойлівага развіцця,
• гатоўнасць шанаваць каштоўнасці і прыватнае жыццё іншых людзей[1].

У наступным артыкуле мне хацелася б паказаць спосабы фарміравання выбраных прынцыпаў ў штодзённай працы школы.

[1] dr Bożena Kubiczek, *Szkoła Demokracji – Szkoła Samorządności. Kompetencje społeczne i obywatelskie uczniów i nauczycieli*, CEO



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

**Рада Вучняў- Самакіраванне Школы (Урад Школы)**

Адзным з краевугольных камянёў дэмакратызацыі школьнага жыцця з'яўляецца стварэнне Рады Вучняў-Ураду , які будзе складацца з прадстаўнікоў усіх клас у школе. Ужо на ўзроўні класы абранне прадстаўнікоў Рады павінна праводзіцца на дэмакратычнай аснове. Часта настаўнікі хочуць выбраць іх на падставе свайго ўласнага меркавання, але менавіта вучні павінны ўдзельнічаць у дэмакратычным галасаванні, каб мець магчымасць выбраць сваіх прадстаўнікоў. Калі склад рады будзе створаны па-іншаму, то гэта можа пазбавіць вучняў задавальнення і прывілегіі ад самавызначэння сваёй дэлегацыі.
Вядома, можна ўвесці некаторыя стандарты, якія будуць адлюстроўваць чаканні кандыдатаў, але яны не павінны датычыцца ўзроўню ведаў вучня, толькі палягаць на ягопрынцыпах, якія адпавядаюць школьным правілам. Такія стандарты павінны быць устаноўлены перад прыняццём рашэння аб стварэнні Рады Вучняў. У процілеглым выпадку, такая дзейнасць будзе разглядацца як умяшальніцтва ў органы мясцовага самакіравання.

Адной з шэрагу праблем у школах з'яўляецца спосаб трактавання выбраных прадстаўнікоў вучняў з боку дырэкцыі ці настаўнікаў. Хоць няма ніякіх сумневаў, што істотны голас мае Рада Бацькоў або Рада Настаўнікаў, часамі школьнае самакіраванне трактуецца як нейкая гульня, якую ніхто не ўспрымае ўсур'ёз. Вось няхай мы дазволім вучням пабавіцца і зробім выгляд, што іх голас істотны для нас. Такі падыход можа прывесці да расчаравання заангажаваных вучняў, а ў будучыні да гублянне жадання, каб займацца актыўнай грамадскай дзейнасцю. Вучні вельмі добра адчуваюць, калі да іх ставяцца сур'ёзна і з павагай, а калі ігнаруюць іх меркаванне, нягледзячы на захаванне межаў павагі.
Але гэта не азначае, што голас вучняў у школе павінен быць вырашальным, і ўсе прынятыя рашэнні павінны падпарадкоўваца менавіта іх волі. Гаворка ідзе аб спецыфічным тыпе грамадскіх кансультацый , якіяадбываюцца з нагоды прыняцця рэзалюцый ў дэмакратычнай краіне. Дырэктар павінен выслухаць меркаванне Рады Вучняў наконт прапанаваных зменаў. Такая кансультацыя выклікае не толькі пачуццё задавальнення ў вучняў , але таксама далучыць іх да адказнасці за тое, як функцыянуе школа, якімі карыстаецца правіламі. Можна сказаць, што вучні часта адчуваюць праблемы, якія неабходна вырашыць у школе, і з задавальненнем ангажуюцца ў іх вырашэнне, прапаноўваюць некалькі варыянтаў магчымых рашэнняў, якія могуць прыцягнуць увагу да больш шырокай школьнай супольнасці, якая таксама можа прыняць удзел у дадзенай праблеме.
Вучні ацэняць той факт , што ў працэс прыняцця рашэння былі заангажаваныя іх прадстаўнікі, і дзякуючы гэтаму, з большым задавальненнем прымуць правілы,

закладзеныя ў гэтай структуры, чым нейкую каманду, якая паступіла “зверху” ад дырэкцыі і настаўнікаў.

Істотна, каб роля Рады Вучняў не абмяжоўвалася "гульнёй". Вядома, арганізацыя розных мерапрыемстваў прыносіць моладзі шмат радасці і дапамагае развіваць кампетэнцыі для супрацоўніцтва, планавання, упэўненасці ў сваіх сілах. Але заангажаванне мясцовых органаў улады менавіта ў такую дзейнасць адсоўвае вучняў ад пачуцця агульнай адказнасці за функцыянаванне школьнай супольнасці. Самакіраванне таксама звязанае з памерам праблемаў, вырашэннем канфліктаў і мастацтвам дыпламатыі. Калі мы хочам сфарміраваць сацыяльную асобу, мы не можам абмяжоўвацца спектрам правілаў, так як гэта выкліча скажэнне праўдзівага малюнку сацыяльнай актыўнасці і можа прывесці да расчаравання.

Каб студэнты ўсведамлялі, што сацыяльнае заангажаванне з'яўляецца адказным заняткам, трэба клапаціцца аб рэгулярнасці паседжанняў Рады Вучняў. Рада павінна збірацца не радзей за адзін раз у месяц, нават калі няма тэрміновых справаў. Такім чынам, мы надаем істотнасць дзейнасці гэтага органа, і паказваем, што сацыяльная асоба не можа палягаць толькі на часовай зацікаўленасці абранай тэмай. Быццё прадстаўніком сваёй класы павінна быць звязана таксама з пачуццём абавязку і адказнасці за прынятае рашэнне.

Істотным аспектам з'яўляецца таксама выбранне апекуна Рады Вучняў сярод настаўнікаў школы. Гэтая асоба з самага пачатку будзе выконваць аб’ядноўваючую функцыю, аказваць дапамогу ў арганізацыі сустрэч. У больш позняй фазе роля гэтага настаўніка павінна быць абмежаваная парадамі да вучняў у іх працы, арганізацыяй дыскусій або зборам заявак. Было б добра, калі б настаўнік натхняў вучняў сваім энтузіязмам і ў гэты ж самы час быў бы здольны знайсці залатую сярэдзіну. Настаўнік, як ужо было сказана, павінен выконваць функцыі апекуна, а не кіраўніка мясцовага ўраду. Ён павінен натхняць вучняў, а не выкарыстоўваць іх для рэалізацыі ўласных ідэй. Павінен быць кіраўніком, які служыць патрэбам, паказваючы напрамкі, але не навязваючы свайго меркавання.

Вельмі істотным з’яўляецца таксама тое, каб вучні мелі давер да настаўніка і бачылі ў ім апекуна, а не цэнзара або шпіена дэрэкцыі. Таксама варта тут выкарыстаць кампетэнцыю настаўнікаў у рэалізацыі адукацыйных праектаў, якія палягаюць на мудрым кіраванні камандай, планаванню працы, падзелу заданняў. Настаўнік павінен быць аўтарытэтам, якога жадаюць вучні, а не тым, да якога яны будуць вымушаныя звярнуцца за парадай.



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

Кожная Рада таксама павінна мець свайго кіраўніка, абранага дэмакратычным шляхам на акрэслены тэрмін. Правядзенне такіх выбараў з'яўляецца вялікім выклікам, калі нам залежыць на тым, каб вучні, абіраючы, прымалі свядомае і прадуманае рашэнне. Роля настаўніка заключаецца ў падрыхтоўцы вучняў да таго, каб стаць адказнымі выбаршчыкамі. Мы павінны лічыцца з тым, што вынікам такіх рашэнняў можа быць абранне найбольш папулярнай асобы ў школе або наадварот. Тым не менш, мы павінны паважаць дэмакратычную свабоду выбару вучняў. Чым больш часу настаўнікі прысвецяць інфармаванню вучняў аб прынцыпах грамадскай адказнасці выбаршчыкаў, тым большы шанец, што выбары кіраўніка не ператворацца ў рэйтынг папулярнасці.

Неабходным таксама з’яўляецца галасаванне ў відочны і сумленны спосаб. Варта падрыхтаваць бюлетэні для галасавання і задбаць, каб кожны вучань мог аддаць толькі адзін голас. Што датычыцца неадпаведнага галасавання, то трэба папярэдзіць, што настаўнікі не павінны прымаць удзел ў галасаванні, так як менавіта вучні самастойна абрірають свайго прадстаўніка. Неабходна памятаць, што нельга прымушаць вучняў удзельнічаць у выбарах. Галасаванне з'яўляецца прывілеем, а не пакараннем. Акрамя таго, вучні высока цэняць магчымасць супольнага прымання рашэнняў, і яўка на выбарах, як правіла, вельмі высокая.

Падлікам галасоў павінна займацца папярэдне выбраная камісія і таксама настаўнік (апекун органу самакіравання), які забяспечыць належны падлік галасоў. Камісія павінна распрацаваць пратакол, які будзе змяшчаць інфармацыю аб яўцы і колькасці галасоў, адданых за канкрэтных кандыдатаў. Гэты дакумент мусіць захоўвацца ў дакумэнтацыі школы, што будзе сведчыць аб сур'ёзным трактаванні справы ўладамі школы.

Добрай практыкай з’яўляецц арганізацыя перадвыбарчых дэбатаў сярод кандыдатаў на пасаду кіраўніка Рады Вучняў.



.

Самі кандыдаты будуць адчуваць, што яны ўзялі на сябе адказнасць , якая патрабуе акрэсленых дзеянняў і заангажавання. Выбаршчыкі могуць задаваць пытанні кандыдатам і мець магчымасць параўноўваць іх погляды, якія датычацца жыцця школьнай супольнасці, са сваімі меркаваннямі на гэты конт. Чым больш сур'ёзна мы

падыдзем да дэбатаў, тым з большай сур'ёзнасць вучні падыдуць да выбараў. Нашыя вучні будуць здольныя зразумець і прыняць розныя погляды кандыдатаў, што будзе з'яўляцца часткай правядзення выбарчай кампаніі. Дэбаты, як правіла, адлюстроўваюць погляды большасці, але з кожным годам вучні атрымліваюць большую дасведчанасць аб тым, як правільна прэзентаваць свае думкі і погляды.

Функцыянаванне Рады Вучняў павінна быць ўпаўнаважана ў статуце школы. Наступным прыкладам з'яўляецца прыклад з запісу са Статуту Гданьскай Сярэдняй Школы.

*Раздзел V*
*Органы сярэдняй школы*
*§ 12*
*Органамі сярэдняй школы з'яўляюцца:*
*a) дырэктар;*
*b) Рада Вучняў;*
*c) Рада Бацькоў;*
*d) Рада Настаўнікаў.*
*§ 13*
*Дырэктар абіраецца на тэрмін 4 год. Рады Вучняў, Бацькоў і Настаўнікаў абіраюцца на год.*
*§ 14*
*Рэзалюцыі Рады сярэдняй школы прымаюцца простай большасцю галасоў у прысутнасці не менш чым паловы асобаў, якія маюць права голасу. [...]*
*§ 23*
*Рада Вучняў сярэдняй школы складаецца з двух абраных прадстаўнікоў з кожнай класы школы. Прадстаўнікі абіраюцца на тэрмін аднаго каляндарнага году.*
*§ 24*
*Кіраўнік Рады Вучняў сярэдняй школы абіраецца на год (ад пачатку каляндарнага году) шляхам агульнага галасавання, арганізаванага Радай Вучняў сярод усіх вучняў у сярэдняй школе Кіраўнік разам з Радай Вучняў з'яўляецца прадстаўнікоm зацікаўленасцей вучняў перад дырэктарам сярэдняй школы і перад дырэктарам, які кіруе школамі. Кіраўнік Рады Вучняў сярэдняй школы з'яўляецца удзельнікам Галоўнай Рады Школаў.*

Школа, у якой функцыянуе Рада Вучняў, можа атрымаць ад гэтага толькі карысць. Заангажаванасць вучняў ва ўсялякія ініцыятывы мае больш істотнае значэнне, калі яны аказваюць ўплыў на істотныя для іх школьныя рэаліі, у якіх яны знаходзяцца пераважную большасць свайго дня. Стварэнне фасаднага органу толькі дзеля таго, каб зрабіць уражанне дэмакратычнага жыцця разыходзіцца з мэтай, а вучні вельмі хутка



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

зарыентуюцца ў намерах школьнай улады, і ў сувязі з вышэй сказаным, актыўнасць вучняў панізіцца; ці каму-небудзь з нас хацелася б заангажавацца ў непрыемную дзейнасць, якая будзе толькі нейкай гульнёй у самаарганізацыю.
Не трэба забываць пра ацэнку дзейнасці Рады Вучняў. Дзякуючы гэтаму, вучні змогуць зрабіць высновы і прымяніць іх у сваіх іншых справах, змогуць ацаніць саміх сябе і ўсталяваць наступныя мэты ў сваёй дзейнасці. Класа павінна адчуваць, што выбраная асоба прэзэнтуе іх погляды.

Відавочна, трэба акрэсліць і зразумець цяжкасці, з якімі нам прыйдзецца сутыкнуцца. Добрае функцыянаванне Рады Вучняў у вялікай ступені залежыць ад прынцыпаў і працы класных кіраўнікоў. Вельмі карыснай і неад'емнай часкай з'яўляецца размова або заняткі на тэму праблемы прэзэнтацыі нейкай групы. Вучні на пачатку заўсёды адлюстроўваюць тэндэнцыю займацца толькі тымі справамі, якія датычацца канктэтна іх саміх. Але дзякуючы выхаваўчай працы, мы можам развіваць правільныя стасункі з прадстаўнікам класы і клапаціцца пра добрую камунікацыю.

## САЛІДАРНАСЦЬ-ПАДТРЫМКА-ДАПАМОГА

У гэтай частцы мне б хацелася перайсці да тэмы фарміравання прасацыяльных адносін. Гэта не можа быць зроблена ў тэорыі шляхам навучання моладзі і асобаў, якія гэтага патрабуюць, толькі дзякуючы таму што яны маюць абавязкі перад лакальнай супольнасцю. Тут выступае патрэба прыняцця удзелу ў дзейнасці. Заангажаванне ў дзейнасць датычыцца як настаўнікаў, так і вучняў.
Мы не патрабуем ад нашых вучняў адчуваць патрэбы іншых людзей, калі яны асабіста не маюць такога стаўлення да іх. Школа павінна спрыяць развіццю пажаданых паводзін, напрыклад, заангажаванню вучняў у працу на карысць іншых людзей.

Валанцёрства дае моладзі пачуцце ўплыву на жыццё адпаведнай супольнасці. Дапамагае выказаць салідарнасць з тымі, каму гэта неабходна, але таксама дапамагае рухацца наперад, дзейнічаючы на карысць выбранай групы,грамадства або канкрэтных асобаў.
Не трэба абмяжоўваць валантэрства да збору грошай або патрэбных рэчаў. Мы павінны паказаць вучням, як варта і неабходна дзяліцца нечым з сябе, а не ад сябе. Трэба дазволіць вучням паглыбіцца ў праблему, у той час падказваючы ім, чым можна займацца ў гэтай справе. Таксама не трэба рабіць уражання, што яны могуць цалкам змяніць свет, але істотна паказаць каштоўнасць хаця б ад самай малой дзейнасці.
Ніжэй прыведзены прыклад добрых практык Клубу Валанцёраў у Гданьскай Сярэдняй Школе.

1. *Тэматычны баль*



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

Ужо некалькі год вучні нашай школы заангажаваныя ў дзейнасць на карысць бедных дзяцей з найбліжшай дзяржаўнай раённай школы. Дапамога палягае перад усім на арганізацыі дадатковай пасляабядовай актыўнасці для дзяцей, у якіх бацькі не ў стане забяспечыць удзелу ў дадатковых занятках.
Дзейнасць Клубу Валанцёраў не абмяжоўваецца арганізацыяй звычайнай дыскатэкі. Вучні разам з настаўнікам-куратарам распрацоўваюць поўны сцэнар балю, у які уваходзіць падрыхтоўка запрашэнняў, пачастунку, конкурсаў, узнагарод, упрыгожванне залі і так далей. Кожны вучань мае сваё асабістае заданне і з'яўляецца адказным за яго рэалізацыю. Усе вучні бяруць удзел менавіта ў балю, бавяць свой час з запрошанымі асобамі і інтэргуюцца з імі. Усё гэта-нязменны і істотны аспект працы валанцёра, бо менавіта ён з'яўляецца нагодай пазнаць праблему, і вучні адчуваюць сябе ўключанымі ў працэс вырашэння гэтай праблемы. Радасць нашых гасцей з'яўляецца самай вялікай узнагародай для вучняў і матывацыяй для далейшай дзейнасці. Моладзі адчувае задаволенасць, якая вынікае з заангажавання на карысць канктрэтных, а не абстрактыных асобаў.

2. *Праца са сталымі асобамі*

Добрай ідэяй з'яўляецца ўсталяванне супрацоўніцтва з інстытуцыямі, якія сістэматычна займаюцца дапамогай тым, хто гэтага патрабуе. Наш Клуб Валанцёраў супрацоўнічае з асяродкам дапамогі сталым асобам. Наколькі проста заангажаваць вучняў у дапамогу іншым дзецям, настолькі ж складаней зрабіць гэта ў дачыненні да старэйшых асобаў; таму вучняў спачатку трэба адпаведна прыгатаваць да гэтага. Мы можам сутыкнуцца з сарамлівасцю і меньшай адчыненасцю моладзі ў стасунку да людзей нашмат старэйшых,чым яна.

Праца валанцёра палягае ў гэтым выпадку часцей за ўсё на тым, каб праводзіць час з адзінокімі пенсіянерамі. Варта паказаць моладзі, якую карысць можна чэрпаць ад гэтага кантакту, як можна выкарыстаць і прымяніць вопыт старэйшых людзей, якія з'яўляюцца сведкамі гісторыі, даступнай толькі ў падручніках і апрацаваннях.

Праца на карысць пэнсіянераў вучыць паважаць сталых людзей, а таксама адлюстроўвае адказнасць маладога пакалення за ўсіх удзельнікаў грамадства. Таксама дазваляе добра адчуць хуткаплыннасць часу.
Эфектам дабрачыннай праведзенай дзейнасці на карысць асобаў, патрабуючых дапамогі, з'яўляецца вялікае заангажаванне вучняў незалежна ад іх узросту. Цяпер дабрачынная дзейнасць з'яўляецца сталым элементам выхаваўчай працы ў школе. Вучні самі заўважаюць патрэбы іншых людзей і прапаноўваюць удзел ў канктрэтнай справе. Магу смела сказаць, што дапамога зрабілася моднай. Наступным эфектам з'яўляецца падвышэнне ўзроўню ведаў і свядомасці вучняў на тэму праблемаў свету, які нас атачае. Гэтае заданне з'яўляецца настолькі істотным таму што большая частка

вучняў школы паходзіць з заможных сем'яў і часта не сутыкаецца з праблемамі беднасці, сталасці, хваробы або інваліднасці. Школа як інстытуцыя вельмі добра прыгатаваная для гэтага і можа ўвесці дзяцей у такія складаныя тэмы бяспечным шляхам.

Салідарнасць і падтрымка таксама павінны праяўляцца ў штодзённым жыцці школьнай супольнасці. Такім чынам, мы вучым адчуваць патрэбы і праблемы групы, у якой мы самі функцыянуем. У школе, якой я кірую, мы прынялі рашэнне парушыць праблему гвалту сяродаднагодкаў, якая не была істотнай з'явай у нашай школе. Але мы прынялі рашэнне, што варта парушыць тэму падтрымкі асобы, якая была падданая гвалту вучнямі менавіта пасля нейкага здарэння; вучні, якія гэта робяць, дэманструюць амаральныя паводзіны. Уласна кажучы, менавіта на такіх вучняў мы накіравалі сваю дзейнасць, прапаноўваючы падтрымку для больш слабой асобы, якую гвалцяць маральна, прыніжаюць. Мы стараліся паказаць вучням, наколькі шмат ад іх залежыць, і якая моц праяўляецца ў той асобе, якая салідарная з пакрыўджанай асобай і знаходзіцца на яе баку.

У сваёй выхаваўчай працы мы выкарысталі матэрыял амерыканскай арганізацыі Pacer (http://www.pacer.org/bullying/), якая мае вялікі вопыт у правядзенні кампаній на карысць супрацьстаяння гвалту сярод аднагодкаў.




Пачатак наш адбыўся 10 кастрычніка ў так званы Дзень Яднання, у межах якога кожны ўдзельнік меў на вопратцы які-небудзь памаранчовы элемент, які сымбалізаваў салідарнасць з ахвярамі гвалту сярод аднагодкаў.
Таксама мы запланавалі актыўнасць для кожнай класы, вынікам якой з'яўляецца заангажаванасць у гэтыя кампаніі. Раз у месяц кожная з клас прэзентавала эфект сваёй дзейнасці, напрыклад, школьны часопіс, артыкул на старонцы ў інтэрнэце, вынікі анкетавання, якое было праведзена сярод моладзі сярдняй школы, прэзентацыя, фільм, кліп, верш.
Кожная з гэтых актыўнасцей была дадаткова прарэкламавана на школьным профілі на Фэйсбуку.
Дадаткова разам з псыхолагамі мы апрацавалі сцэнар воркшопаў на тэму як парадзіць сабе з агрэсіяй на розных узроўнях, якія былі праведзеныя ў класах. Моладзь разам з псыхолагам і настаўнікам апрацавала тэму агрэсіі і злосці, якая датычыцца вучняў і сытуацый, у якіх вучань з'яўляецца сведкам гвалту іншай асобы.



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

Адным з найбольш істотных эфектаў праведзенай дзейнасці з'яўляецца яшчэ большая інтэграцыя вучняў Гданьскай Аўтаномнай сярэдняй школы. Дзейнасць сутыкнулася таксама з вялікай падтрымкай з боку бацькоў, якія цешыліся, што парушылі гэтую складаную тэму з дзецьмі; адначасова,стала вядома,што такія сытуацыі гвалту не заакцэптаваныя ў нашай школе.Ужо падчас мінулага школьнага году моладзь часцей пераказвала дарослым (бацькам, настаўнікам, псыхолагам, педагогам) абсэрвацыі, якія іх хвалявалі. Часцей за ўсё яны хваляваліся за псыхічны стан сябра ці сяброўкі. Падаецца, што тэма падтрымкі слабейшых дабілася прызнання сярод вучняў.

## АД ЛАКАЛЬНАГА ПАТРЫЯТЫЗМУ ДА МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІСТВА

Наступнай істотнай грамадскай кампетэнцыяй вучняў з'яўляецца пачуццё прыналежнасці да ўласнага атачэння, краіны, Эўропы ў цэлым і свету. Ідэнтыфікацыя з рэгіёнам або краінай, з якой мы паходзім, прыводзіць да ўсталявання паспяховых міжнародных кантактаў, хаця магло б падавацца, што патрыятычная пазіцыя ідзе ўразрэз з пазіцыяй адчыненасці свету. Няма нічога больш памылковага за гэта. Свядомасць лакальнай прыналежнасці , каштоўнасці і гісторыі ўласнай краіны паказвае пачуццё прыналежнасці да колаў, якія пастаянна пашыраюцца, пры адначасовым зразуменні сваёй уласнай істотнай ролі ў свеце.

Няма гаворкі пра выхаванне бяздзейных касмапалітаў, але людзі, якія ўсведамляюць каштоўнасць сваёй уласнай культуры, з'яўляюцца адчыненымі на пазнаванне іншых культур. Жыхары канкрэтнай краіны падыходзяць з цікавасцю і шацункам да іншых дзяржаўных, культурных і рэлігійных сыстэмаў.

Дзякуючы ўдзелу у міжнародных праектах, вучні маюць магчымасць пазнаць культуру, традыцыі, звычаі і таксама стыль жыцця жыхароў праз асабісты кантакт з сем'ямі, настаўнікамі і вучнямі з іншых краін. Наяўнасць вучняў з краін-партнёраў ў школьным жыцці нашых вучняў у школах-партнёрах спрыяе барацьбе са стэрэатыпамі і забабонамі аб нацыянальных асаблівасцях жыхароў краін, з якімі мы рэалізуем праект.
Вопыт, атрыманы ў ходзе сустрэч у розных краінах прыводзіць да пашырэння ведаў на тэму роднага горада і бацькаўшчыны ў эўрапейскім кантэксце.

Варта падкрэсліць, што мэтай міжнароднага супрацоўніцтва з'яўляецца не толькі выяўленне падабенства паміж людзьмі ці краінамі. Менавіта гэтыя адрозненні дазволяць зразумець каштоўнасць разнастайнасці свету. Дазволяць паказаць моладзі, што разнастайнасць не супярэчыць зінтэграванасці акрэсленых прынцыпаў, асабліва грамадзянскіх.



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

Добрай практыкай з'яўляецца падрыхтоўка вучняў да поўнага заангажавання ў прэзентацыі сваёй бацькаўшчыны, яе традыцый і каштоўнасцяў іншых краін-партнёраў. Такім чынам мы спрыяем развіццю патрыятычнага стаўлення, пачуцця сутворчасці супольнасці,да якой мы належым. Пачуццё гонару ад прыналежнасці да пэўнага грамадства забяспечвае сумесную працу, якая не апіраецца на комплексах або канкурэнцыі. Важна паказаць моладзі розніцу паміж патрыятызмам і ксенафобіяй; цікаўнасцю і зайздрасцю.

Як я ўжо ўзгадвала, ўмовай паспяховага міжнароднага супрацоўніцтва з'яўляецца пачуццё патрыятызму і веды аб сваёй уласнай краіне. Як выхаваць у моладзі любоў да краіны ці рэгіёну? Зноў жа, варта ўцягнуць яе ў канкрэтныя дзеянні, не пакідаючы гэтага толькі на тэарэтычным плане.

Прыкладам фарміравання такіх адносінаў з'яўляецца рэалізацыя праекта, які палягае на апецы над месцам, помнікам, звязаным з гісторыяй рэгіёну. Не будзе дастаткова правесці тут простую разавуя акцыю. Гаворка ідзе аб тым, каб вучні адчулі адказнасць за важнае месца для лакальнай супольнасці і для самых сябе. Прыкладам такой дзейнасці можа быць праект апекі над помнікам экспартавання габрэйскіх дзяцей далей ад небяспечнага падчас вайны Гданьска. Праект складаўся з двух частак: перашай: акцыі (разавай) і другой (доўгатэрміновай).

Першая частка палягала на творчай прэзентацыі падзей, якія адбываюцца вакол помніка, каб прыцягнуць увагу жыхароў Гданьска да гэтага істотнага для горада аб’екта, і каб паказаць яго гісторыю. Вучні, апранутыя ў гістарычную вопратку той эпохі, з валізкамі, сабраліся на Цэнтральнай станцыі, каб адзначыць гадавіну сыходу першага цягніка з дзецьмі-уцекачамі. У супрацоўніцтве з уладамі горада распрацавалі інфармацыйную ўлётку, якую давалі зацікаўленым мінакам.





Другі этап патрабаваў больш прыгатаванняў фармальных і доўгатэрміновага заангажавання. Вучні разам з каардынуючым настаўнікам супрацоўнічалі з уладамі горада і Радай Дарог і Зяляніны наконт догляду за помнікам і працай па яго ачыстцы і яго ваколіцах. Яны павінны былі скласці адпаведную заяву, дэкларацыю і прайсці ўвесь афіцыйны і бюракратычны шлях. Таксама іх задачай было атрымаць веды аб правілах захавання помніка так, каб працамі па навядзенню парадку не пашкодзіць аб'ект.
Цяпер вучні, змяняючыся раз на тыдзень, прыходзяць наводзіць парадак каля помніку.Гэта ўжо ператварылася ў звычку і ў пачуцце адказнасці перад прынятымі абавязкамі.

Дзякуючы гэтаму праекту, нам удалося рэалізаваць некалькіх мэтаў:
.
- абуджэнню цікавасцю гісторыяй горада
- фарміраванню пачуцця талерантнасці і падкрэсліванне каштоўнасці культурнай разнастайнасці Гданьску
- узятай адказнасцю за чысціню помніка, якая з'яўляецца сведчаннем шацунку да герояў гэтых падзей
-спрыянню супрацоўніцтва і валантарыяту.

Без сумневу, фарміраванне патрыятычнай асобы таксама павінна быць звязана з святкаваннем нацыянальных святаў. Не вельмі эфектыўнымі ў гэтай сытуацыі з’яўляюцца ўрачыстыя заклікі, таму што яны не спрыяюць заангажаванню моладзі, а хутчэй з’яўляюцца для вучняў нуднай неабходнасцю.

Я заклікаю вас да арганізацыі гістарычных вечароў, у якіх ёсць месца для прэзентацый, прыгатаваных вучнямі і для дэбатаў па важных пытаннях, звязаных з гэтай гадавінай. У Гданьскай Аўтаномнай сярэдняй школе такія вечары праводзяцца кожны год у сувязі з паслядоўнымі гадавінамі святкавання незалежнасці Польшчы. Настаўнікі, якія падрыхтоўваюць такія спатканні, вызначаюць тэму і прапаноўваюць вучням падрыхтаваць прэзентацыю на гэтую тэму.

Моладзь перад гэтым павінна прайсці свайго роду кастынг, падчас якога выбіраюцца найбольш цікавыя прэзентацыі. Настаўнікі імкнуцца звярнуць увагу на розныя пункты гледжання, якія датычацца гэтага пытання і так, напрыклад, адзін з вечароў быў прысвечаны Юзэфу Пілсудскаму і Раману Дмоўскаму, якія мелі розныя ўяўленні пра незалежную польскую мову. Прадстаўленне розных пунктаў гледжання дазваляе заангажаваць вучняў у дыскусію, якая прымушае нас да крытычнага асэнсавання і выказвання свайго меркавання. Вядома, дыскусія заўсёды адбываецца пад кіраўніцтвам настаўніка.



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych
w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

Такія сустрэчы вымагаюць ад вучняў праяўленне цікавасці да нацыянальных пытанняў, гісторыі ці патрыятызму ў яго сучасным разуменні

**СВАБОДА ПЕРАД УСІМ?**

Для таго каб сфарміраваць дэмакратычныя прынцыпы, у працы з вучнямі варта падкрэсліць істотную ролю свабоды ў жыцці грамадзяніна. Паняцце "свабоды" можа быць трактаванае ў розных сэнсах, напрыклад, свабода выбару, свабода слова, свабода сумлення. Дзякуючы гэтаму, мы пакажам моладзі шлях да незалежнасці ў судах і ў меркаваннях, і аднлачасова пакажам небяспечныя бакі дэмагогіі і розных маніпуляцый.

Не варта забываць, што межы свабоды пачынаюць свой бег там, дзе пачынаецца крыўда іншай чалавечай істоты. Свабодны грамадзянін павінен мець пачуццё абавязку перад грамадствам, у якім ён жыве. Ён павінен клапаціцца не толькі аб задавальненні сваіх уласных патрэбаў, але і быць адчувальнымі да патрэбаў супольнасці і дзейнічаць ад яе карысць.

У школе вялікай праблемай з'яўляецца свабода слова. У гэтым іерархічным грамадстве вучняў часта штурхаюць на выкананне ролі асобаў, якія павінны некрытычна прымаць прысуд настаўнікаў. Такім чынам, мы вызваляем вучня ад мыслення, ад абавязку крытычнай рэфлексіі для ўсіх з'яваў. Вам не патрабуецца шмат рэсурсаў для таго, каб вучні маглі выказваць свае думкі. На большасці з заняткаў мы можам адвесці на гэта час. Нам трэба заахвочваць іх выказваць свае ўласныя погляды, але ў той жа самы час трэба іх вучыць мастацтву аргументацыі, творчай рэфлексіі і імкненню да правядзення дэмакратычнага дыялогу і нават спрэчак.

Вельмі карысным інструментам у гэтай справе з'яўляюцца оксфардскія дэбаты, чый сістэматычны характар дазваляе дакладней выказаць сваё меркаванне цывілізаваным і культурным чынам. Менавіта так мы можам паказаць вучням, што правядзенне нават самых складаных спрэчак павінна праходзіць у атмасферы ўзаемапавагі.

**ВОЛАТЫ ШТОДЗЁННАСЦІ**

Спасылка ў працы на прынцыпы выхаваўчай постаці, якія з'яўляюцца мадэлямі паводзін у грамадстве, можа натхніць вучняў. Трэба мець на ўвазе тое, што нельга спасылацца толькі на постаці манументальнага характару, але і паказаць вучням герояў штодзённага жыцця, якія працуюць на карысць грамадства, у якім нашы вучні жывуць.

Варта арганізоўваць сустрэчы з сацыяльна заангажаванымі асобамі, дзейнасць якіх датычыцца невялікага кавалка рэчаіснасці, але ў той жа час істотна ўплывае на якасць функцыянавання грамадства. Давайце пакажам моладзі простых людзей, якія займаюцца простымі праблемамі і прысвячаюць свой час для іншых. Пакажам, што



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych
w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

нават самыя маленькія дзеянні адной асобы ўносяць свой уклад у пазітыўныя сацыяльныя змены. Асноўнае значэнне надаецца безпасярэдняму кантакту вучняў з такімі людзьмі, магчымасцю задаваць пытанні і дыскутаваць.
Яшчэ адной ідэяй можа быць зарганізаванне школьнага конкурса на “звычайнага героя". Мы павінны заахвочваць маладых людзей да таго, каб знайсці ў сваім асяроддзі людзей, якія працуюць на карысць грамадства, у якім яны жывуць, якія выступаюць супраць несправядлівасці, абараняюць слабых, бяруць ініцыятыву ў свае рукі, ўзбагачаючы гэтым жыццё мясцовага грамадства. Пошук такіх асобаў у сям'і, сярод суседзяў, сяброў і правядзенне з імі інтэрв'ю або прадстаўленне іх постацяў будзе несамавітай крыніцай натхнення для вучняў. Гэта пакажа ім, што кожны чалавек выконвае істотную ролю ў грамадстве, і што кожны з іх можа таксама стаць такім героем. Не варта спасылацца толькі на “вялікіх” людзей, падзеі або дзейнасць ў нацыянальным маштабе. Чым бліжэй мы знойдзем героя, тым бліжэйшым ён стане для нашых вучняў.

У назве гэтага раздзелу я не безпадстаўна выкарыстала множны лік. Важным аспектам з'яўляецца ўсведамленне таго, што грамадская актыўнасць павінна быць незалежнай, прыватнай дзейнасцю, але гэта патрабуе супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння многіх людзей. Чым больш людзей будзе заангажавана ў дзейнасці, тым большая верагоднасць поспеху. Таму не варта вымагаць ад вучняў самастойных дзеянняў, але трэба падтрымліваць праекты, палягаючыя на супрацоўніцтве. Вядома, яны павінны быць старанна прадуманыя і мець мудра размеркаваныя задачы. Можна звярнуць увагу вучняў на тое,што супраца з’яўляецца больш эфектыўнай.

Супрацоўніцтва вучыць таксама адказнасці за заданне. Вучні будуць матываваць адзін аднаго, каб выканаць кожную пастаўленую перад імі задачу, таму што ад гэтага залежыць поспех усяго праекту.
На пачатковым этапе, можна дазволіць вучням выбраць сваё праектнае заданне, але варта паступова падрыхтаваць іх да працы з рознымі асобамі, з якімі яны будуць злучаныя не толькі сімпатыяй, але агульнай мэтай і каштоўнасцямі.
Можна запрапанаваць вучням даследаваць істотную праблему для лакальнай супольнасці і распрацаваць стратэгіі па яе вырашэнню. Можна пачаць з ролевых заданняў, каб не штурхаць вучняў адразу ў глыбокую ваду.

Выкарыстанне драмы ў грамадскай адукацыі дазволіць нашым вучням мець дачыненне з канкрэтнай праблемай бяспечным шляхам.

Вучням можа быць прадстаўлена гіпатэтычная сітуацыя, напрыклад, такая, калі школа будзе забяспечваць бесплатнае харчаванне для вучняў з малазабяспечаных сем'яў, але з наступнага тыдня гэтуб практыку прыйдзецца спыніць з-за адсутнасці сродкаў. Мы

папросім, каб вучні апрацавалі пэўныя стратэгіі для вырашэння гэтай праблемы, якія павінны будуць паказваюць магчымыя шляхі атрымання спонсараў, прадуктаў і г.д. Варта звярнуць увагу на інстытуты, да якіх яны маглі б звярнуцца за дапамогай. Вучні могуць быць заангажаваныя да падрабязнага прадстаўлення ідэй, падзялення заданняў і прагназавання наступстваў планаваных мерапрыемстваў.

Пасля правядзення такога кшталту трэнінгу, мы звяртаем увагу вучняў на канкрэтную праблему, якая можа быць сапраўды вырашана. Не варта тут усталёўваць нейкіх высокіх чаканняў, але шляхам разважання мы можам паказаць як дасягнуць гэтай мэты. Нішто не матывуе больш за перашкоду на ранніх стадыях працы. Падчас выбару мэты можна звярнуцца да псіхалогіі бізнесу і паспрабаваць акрэсліць гэта як SMART.

Мэты для вучняў павінны быць настуныя:
S – *simple* – просты, недвухсэнсоўны, не пакідаючы месца для розных інтэрпрэтацый;
M – *measurable* – вымеральны, напрыклад, той, ступень рэалізацыі якога можа быць адназначна акрэсленай;
A – *achievable* – дасягальны, рэалістычны;
R – *relevant* – істотны, вартасны для асобаў, якія будуць яго рэалізоўваць;
T – *timely defined* –акрэслены ў часе.

Калі акрэсленыя заданні будуць палягаць на гэтых умовах, гэта дазволіць вучням заангажавацца ў дзейнасць ад яе пачатку да самага канца. Усё гэта таксама ўплывае на поспех.

## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ

Дэмакратычная краіна гарантуе правы сваім грамадзянам, але ў той жа час накладае на іх абавязкі. Яны замацаваныя ў канстытуцыі, якая з'яўляецца найбольш істотным актам заканадаўства ў краіне. Мэтай дзяржавы з'яўляецца таксама забеспячэнне дабрабыту і правапарадку ў краіне. Грамадзяне, якія захоўваюць прынцыпы і выконваюць свае абавязкі, таксама ўносяць свой уклад у гэта.

Пад паняццем грамадзянскага абавязку варта разумець канстытуцыйна ўстаноўленыя правілы, накіраваныя на грамадзян краіны. Кожны з нас абавязаны,напрыклад,паважаць правы іншых і выконваць закон. Аб дэталях, якія датычацца парушэння ці выканання нормаў права, нас інфармуюць канкрэтныя праўныя кодэксы, такія як кодэкс крымінальнага права або грамадзянскі кодэкс.

Пра грамадзянскія абавязкі таксама кажа канстытуцыя. У адпаведнасці з ёй, найбольш істотнымі з'яўляюцца:



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych
w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

• лаяльнасць і клопат аб агульным дабрабыце нацыі і грамадства
• выкананне закона
• несці цяжар на карысць дзяржавы (напрыклад, выплата падаткаў)
• абарона Радзімы
• клопат аб навакольным асяроддзі, а таксама адказнасць за яго пагрозу і разбурэнне.

У школе, як ў мікрадэмакратыі, мы павінны варта падкрэсліць ролю як правоў, так і абавязкаў членаў дадзенай супольнасці. Адпаведныя запісы павінны знаходзіцца ў статуце школы.
Ніжэй прыведзены прыклад такога запісу са статута Гданьскай Аўтаномнай Сярэдняй Школы:

*§ 21*
*Вучні сярэдняй школы маюць права на:*
*а)на зіндывідуалізаваны апекунча-дыдактычны працэс , дастасаваны да іх патрэбаў і магчымасцяў, а таксама на адпаведную апеку і адукацыю;*
*б) на добрую падрыхтоўку для далейшай адукацыі і сацыяльнага функцыянавання;*
*в) на пазнанне працэсу навучання і выхавання;*
*г)на выкарыстанне дадатковых гадзін кансультацый з настаўнікамі ва ўзгоднены час у абгрунтаваных выпадках (напрыклад, выкарыстаны ліміт адсутнасці на занятках без паважнай падставы, падрыхтоўка да прадметнай алімпіяды);*
*е)на неабмежаваную самастойную дзейнасць;*
*е) на павагу асабістай годнасці;*
*г) на абарону ад усіх формаў фізічнага ці псіхалагічнага гвалту.*

*§ 22*
*Вучні сярэняй школы абавязаны:*
*а) удзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, якія ахопліваюцца навучальным планам і прадставіць абгрунтаванне гадзін адсутнасці;*
*б) эфектыўна выкарыстоўваць час, адведзены для навучанне;*
*в) сістэматычна рыхтавацца да школьныз заняткаў*

Як вы можаце бачыць, у Гданьскай Аўтаномнай Сярэдняй Школе дамінуюць правы, але і абавязкі таксама акрэслены. У іншых месцах статута, мы можам знайсці запісы аб узаемапавазе, аб тым як варты прадстаўляць школу і як выконваць правілы паводзін. Усе гэтыя запісы ў роўнай ступені істотныя, але ў той жа час незалежныя адзін ад аднаго. Іх падзел заключаецца ў тым, што мы не можам адмаўляць правы, прадастаўленыя асобай, якая не выканала свае абавязкі. Вядома, такі вучань можа парушыць устаноўленыя санкцыі, але цяжка сабе ўявіць, што яму будзе адмоўлена ў праве на павагу годнасці з-за таго, што ён не рыхтаваўся сістэматычна да заняткаў ў



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych
w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

школе.
Палажэнні ў статуце не могуць быць мёртвымі. Іх павінны паважаць усе ўдзельнікі школьнай супольнасці, што таксама датычыцца і настаўнікаў. Калі педагогі будуць парушаць прынцыпы статуту, то грамадская адукацыя не прывядзе да чагосьці добрага. Не варта вымагаць ад вучняў сацыяльнага заангажавання, калі мы будзе засяроджавацца толькі выключна на іх абавязках.

Гэта не павінна адбывацца пад пагрозай пакарання, а толькі з дапамогай супольных каштоўнасцяў.

Многія настаўнікі занепакоеныя тым, што правы, якія прадастаўляюцца вучням, могуць прынесці хаос і анархію ў школу. Нішто не можа знаходзіцца так далёка ад праўды. Доказам дэмакратызацыі школьнага жыцця з'яўляецца, напрыклад, не толькі рэалізацыя правоў і абавязкаў, актыўны удзел, ўспрыманне разнастайнасці ў якасці каштоўнасці, але таксама і дысцыпліны, іншымі словамі выкананне ўстаноўленых правілаў і парадкаў.

Вельмі істотным пытаннем з'яўляецца празрыстасць устаноўленых правілаў і шляху кіравання школай. Іншым істотным фактарам у дэмакратызацыі школьнай супольнасці з'яўляецца адукацыя на аснове каштоўнасцяў, супрацоўніцтве, камунікацыі і заангажаванні. Нашы вучні будуць патрабаваць падтрымкі настаўнікаў, якія высупаюць іх гідамі ў свеце. І настаўнікі ў той жа час будуць навучаць толькі дэмакратычным шляхам на кожным узроўні і на кожных занятках.

## СВАБОДА СЛОВА І АДКАЗНАСЦЬ

Свабода слова з'яўляецца адным з прыярытэтных правоў грамадзяніна дэмакратычнай краіны. Тым не менш, у эпоху Інтэрнэту і сацыяльных медыяў, якія часта працуюць ананімна, гэтую з'яву неабходна абмеркаваць з моладдзю.

Свабода слова азначае, што кожны з нас мае права на выказванне свайго меркавання і на свабоду атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю. Свабода выказвання меркаванняў гарантуе забарону цэнзуры сродкаў масавай інфармацыі, а таксама ліцэнзаванне прэсы. Выказванне ўласнага меркавання з'яўляецца каштоўнасцю, якую трэба песціць сярод моладзі. Тым не менш, трэба звярнуць увагу на адказнасць за свае словы, на розніцу паміж меркаваннем і фактам, паміж адзнакай і паклёпам.

Інтэрнэт стаў не толькі свабоднай прасторай, але і ананімнай. Менавіта гэтая рыса часам стварае праблемы. Здараецца, што ананімны карыстальнік праяўляе агрэсію ў дачыненні да іншых, абражае іх і зневажае. Ён адчувае сябе беспакараным. Але

беспакаранасць не з'яўляецца сінонімам свабоды. Ад свядомага грамадзяніна таксама трэба патрабаваць пачуцця такту да пакут іншых і павагі іх поглядаў.

Праблема кібергвалту накладае абавязак на настаўнікаў, каб растлумачыць моладзі, што адбываецца ў гэтай галіне. Хопіць простага праглядання каментароў іншых карыстальнікаў пад нейкім артыкулам у інтэрнэце і аналізавання іх з моладдзю нават для занятках па інфарматыцы. Давайце пакажам вучням тонкую мяжу паміж прадстаўленнем уласнага меркавання і вербальнай агрэсіяй. Можна прысвяціць класную гадзіну для навучальнага семінара па выражэнню крытыкі і іншадумства, але з павагай да суперніка. Давайце папросім вучняў падрыхтаваць крытычную аргументацыю наконт поглядаў настаўніка. Добрай ідэяй з'яўляецца таксама аналіз спрэчак выбітных інтэлектуалаў. Звернем ўвагу на тое, чым адрозніваецца крытыка поглядаў і меркаванняў ад асабістага праяўлення агрэсіі. Абмяркуем прынцып канструктыўнай крытыкі.
*Аб чым варта памятаць? Зваротная сувязь павінна, перш за ўсё, адносіцца да канкрэтнай сітуацыі і павінна быць накіравана на факты, а не на асобу і на ўсё яго функцыянаванне. Добра, калі мы выкарыстоўваем канкрэтныя аргументы і размаўляем са свайго ўласнага пункту гледжання аб добрых і дрэнных баках падзеі, а не аб суперніку. Калі мы засяродзімся на самавыражэнні, а не на пагрозах і доказах віны ці дэманстрацыі таго, што іншая асоба горш, у нас ёсць магчымасць пачуць і змяніць тыя мадэлі паводзін, якія нам не адпавядаюць. Тады можна размаўляць пра тое, якія можна знайсці вырашэнні падобных сітуацый, каб такое больш не адбывалася ў будучыні. І вы можаце знайсці іх у дыялогу, прапаноўваючы свае ідэі, звяртаючы ўвагу на крэатыўнасць іншага боку і з шацункам прымаючы яго прапановы як свае ўласныя.*
Гэтыя правілы дазволяць вучням падрыхтавацца да актыўнага ўдзелу ў сацыяльным дыялогу.

**ТАЛЕРАНТНАСЦЬ І ПЛЮРАЛІЗМ**

Паняцце талерантнасці трактуецца ў адукацыі ва ўсіх выпадках. Мы запісваем яго ў статутах місіі школы, ставім яго ў якасці прыярытэту ў нашай выхаваўчай працы. Нашы вучні з ахвотай прэзентуюць сябе як талерантных асобаў, але ня ведаючы да канца, чым канкрэтна з'яўляецца талерантнасць. Распаўсюджанай памылкай з'яўляецца атаясамліванне такога стаўлення ці нават захапленне ім. Між іншым, талерантнасць не што іншае як разуменне людзей, якія адрозніваюцца ад нас і нашых поглядаў. Гэтая разнастайнасць павінна быць асновай для выхавання моладзі і іх сацыяльнай кампетэнцыі. Не трэба спрыяць развіццю ўтапічнага бачання свету моладдзю, у якім усе павінны згаджацца адзін з адным. Можна паказаць прыгажосць адрозненняў.

Давайце будзем вучыць іх паважаць іншага чалавека, вучыць талерантнасці, разуменню іншасці.

Пакажам , што талерантнасць пачынаецца на ўзроўні сям'і , класа або школы. Вядома, нашы вучні ў стане выявіць прыклады нецярпімасці ў жыцці школьнай супольнасці, якія датычацца заможнасці , стылю вопраткі або зацікаўленяў . Нам не трэба пераходзіць да глабальных праблемаў нецярпімасці, якая датычыцца сэксуальнай арыентацыі , рэлігіі або паходжання людзей. Мы павінны заахвочваць маладых людзей да аналізавання сваіх ўласных поглядаў наконт іншых ў школьным асяроддзі. Варта звярнуць увагу на крыўду і спосабы яе праяўлення. Добрым будзе прапанаваць класе падрыхтаваць сацыяльную кампанію на тэму талерантнасці ў школе. Гэта будзе істотна, бо праблема з'яўляецца блізкай да вучняў. Спасылка на наш падворак стане палігонам, на якім можна будзе спраўдзіць ці прапаваныя ідэі могуць быць рэалізаваны ў жыцці. Таксама дазволіць адказаць на пытанне , ці я з'яўляюся талерантным, або гэта іншыя людзі не паводзяць сябе адпаведным чынам.

Сацыяльны плюралізм паходзіць ад філасоўскага погляду на чалавечую прыроду і мае на ўвазе, што кожная асоба з'яўляецца непараўнальнай , і яе будова не можа быць абмежавана адной універсальнай каркаснай структурай. Разнастайнасць і непадобнасць –гэта натуральныя характарыстыкі чалавецтва.
Перш за ўсё, гэта пераходзіць на канцэпцыі чалавека як самастойнага, аўтаномнага і свабоднага індывіда. Для людзей, якія адрозніваюцца поглядамі, ладам жыцця і каштоўнасцямі - гэта ўсе з'яўляецца натуральны станам і не можа быць знішчана. Плюралізм-гэта эфект чалавечага розуму. Разнастайнасць з'яўляецца дынамікай грамадскага жыцця і адлюстраваннем свабоды. Трэба адмовіць усім спробам быцця аднолькавымі.[2]

Каб грамадства насіла плюралістыны характар, яно павінна быць адчыненым на міжасабовыя і міжгрупавыя адрозненні. Неабходнай умовай існавання плюралізму з'яўляецца талерантнасць, якая нясе разнастайнасць.

Давайце арганізуем школьны фестываль зацікаўленасцяў вучняў. Дазволім класам падрыхтаваць прастору для яго правядзення, дзе вучні запрэзентуюць свае багатыя зацікаўленасці. Прапануйце вучням даследаваць і пастарацца зразумець адрозненні паміж інтарэсамі класаў. Потым трэба будзе ім сказаць, каб яны выбралі на іх думку найбольш цікавую прэзентацыю. Такім чынам, мы пакажам, што плюралізм і талерантнасць не вызваляе нас ад абавязку зрабіць усвядомлены выбар ідэй, з якімі мы сябе ідэнтыфікуем.

[2] http://www.demokraci.pl/slownik/p/122-pluralizm-

Не варта чакаць яднання канцэпцыі з грунту антаганістычнай глебы. Пакажам, што каштоўнасць плюралізму палягае, у прыватнасці, на стварэнні шырокага спектру, і на адказнасці кожнага грамадзяніна, каб зрабіць свядомы выбар у адпаведнасці з маральнымі каштоўнасцямі, якія яна прадстаўляе. Талерантнасць, якая датычыцца розных пазіцыяў, з'яўляецца неабходнай умовай для функцыянавання плюралістычнага грамадства, але яна павінна быць вызваленыя ад крытычнага мыслення наконт прынцыпаў і каштоўнасцяў, якімі кіруецца група ці індывід.

**ЗНАХОДЖАННЕ Ў СВЕЦЕ**

У папярэдніх раздзелах я заклікала да мабілізацыі моладзі і супрацьстаяння праблемам на ўзроўні школы або класы. Тым не менш, мы павінны быць асцярожныя з тым, каб са школьнай супольнасці не стварыць ізаляваны свет, да якога не дасягнуць праўдзівыя драмы знешняй рэчаіснасці. Сацыяльныя кампетэнцыі нашых вучняў таксама павінны прымяняцца ў больш шырокім кантэксце, для таго, каб яны маглі іх выкарыстаць ў сваім аўтаномным дарослым жыцці.
Абавязкам школы і настаўнікаў з’яўляецца не толькі аказванне дапамогі вучням у вырашэнні іх праблем, але і дапамогі ў разуменні свету і правілаў, якія ім кіруюць. Часта мы спрабуем абараніць нашых дзяцей ад сучаснай рэчаіснасці або драматычных падзей, што адбываюцца ў розных месцах свету. Гэтае пачуццё бяспекі не азначае пазбягання канфрантацыі або размовы з вучнямі аб падзеях, якія ўплываюць на жыццё сучасных супольнасцяў. Маладыя людзі таксама бамбардыраваныя праз СМІ інфармацыяй аб бягучых падзеях, а ў школе павінна знайсціся месца для сумеснага абмеркавання і нават перажывання.

У 2010 годзе Польшча была ўзрушаная паведамленнем аб прэзідэнцкай авіякатастрофе і гібелі шматлікай палітычнай эліты. Гэта было траўматычным вопытам для ўсяго грамадства. З’яўляючыся дырэктарам школы, я не магла сабе ўявіць, што ў гэтай сітуацыі можна было б не парушаць парадак дня і працягваць нармальную дзейнасць, як быццам нічога не здарылася. Гаворка ішла не толькі пра шок ад трагедыі , але і пра тое, каб паказаць згуртаванасць і думкі адносна гэтых падзей.
З самай раніцы мы арганізавалі акцыю, каб ушанаваць памяць ахвяраў катастрофы і не пакідаць вучняў сам-насам з разважаннямі на гэтую тэму. Акцыя была формай яднання ў жалобе і аб’яднала супольны вопыт ўсіх удзельнікаў школьнай супольнасці.
Акрамя таго, першыя заняткі былі прысвечаныя размове з вучнямі пра тое, што здарылася, тое, што яны адчуваюць, і аб чым думаюць. Настаўнікі ў вельмі збалансаваны спосаб праводзілі наступныя заняткі, аналізуючы стан сваіх вучняў.

З пэўнасцю можна сказаць, што сярод нашых вучняў былі асобы, якія не праявілі ніякай цікавасці да гэтай тэмы, але мы вырашылі, што нашай задачай з’яўляецца



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

выхаванне моладзі, якая мае пачуццё прыналежнасці да сваёй мясцовасці, краіны, Еўропы і свету. Моладзь, якая рэагуе на бягучыя падзеі і займае на гэты конт пэўную пазіцыю.
Падобнае мерапрыемства мы арганізавалі для нашых вучняў , якое было звязана з дзіцячай Бесланскай трагедыяй, калі адбылася атака на Сусветны Гандлёвы Цэнтр. Гэта справа сустрэлася з высокай пахвалой бацькоў, якія падкрэслівалі, што такім чынам вучні выявілі, што лягчэй падзяліцца эмоцыямі, звязанымі з гэтай трагедыяй.

**ЧАЦВЁРТАЯ ЎЛАДА**

У дэмакратычнай краіне свабодныя СМІ служаць для кантролю органаў дзяржаўнай улады, і менавіта таму так істотна, каб яны былі незалежныя. Не варта забывацца пры гэтым, што яны выконваюць ролю множнікаў, прадстаўляючы погляды аўтараў, звязаных з гэтай тэмай. Яны не толькі з’яўляюцца аб'ектыўнай крыніцай інфармацыі аб бягучых падзеях, але і трыбунай аглашэння розных меркаванняў. З-за гэтага надзвычай істотнай кампетэнцыяй грамадзяніна дэмакратычнай краіны з'яўляецца крытычная рэфлексія аб способе прадстаўлення навін і крытычны аналіз дзейнасці крыніц інфармацыі. Давайце проста вучыць адрозніваць факты ад меркаванняў.

Для гэтага варта прысвяціць занятки на правядзенне семінараў, якія датычацца крытычнага падыходу да сродкаў масавай інфармацыі. Лепш за ўсё было б прааналізаваць розныя способы передачы інфармацыі аб адной канкрэтнай падзеі : газетны, тэлебачанне і электронны. Давайце паспрабуем з вучнямі на падставе гэтай інфармацыі дакладна вызначыць факты, якія мелі месца. Таксама можна паспрабаваць пабудаваць наступныя пытанні:
- Што было прадстаўлена?
- Які загаловак?
- Як чынам паказана інфармацыя?
-Ці можна пабачыць асабістае стаўлене журналіста да прэзентаваных падзей?
.
Такі сэмінар пабудаваны на актуальных прыкладах, каб моладзь мела не толькі пачуццё практычнага характару заняткаў, але і наўмыснага адбору паведамленняў ад настаўніка. У той жа самы час не трэба забываць аб поўным праве незалежных сродкаў масавай інфармацыі выказваць сваё ўласнае меркаванне. Не будзем вызначаць, хто мае рацыю, але давайце паглядзім на разнастайнасць меркаванняў на гэтую тэму. Нашай мэтай з’яўляецца прыцягненне ўвагі да наступстваў некрытычнага прыняцця масавай інфармацыі як факту. Можна прадэманстраваць, што большасць навін складаецца з фактаў і меркаванняў, і свядомы грамадзянін ведае аб гэтай праблеме і развівае свае ўласныя погляды на бягучыя падзеі.
Таксама можна заангажаваць вучняў весці школьную старонку ў інтэрнэце, на якой



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

будуць змяшчацца іх артыкулы. Варта папрасіць некалькі вучняў аб напісанні артыкулаў на тэму адной са школьных падзей. Тады будзе бачна, наколькі розныя падыходы з’явяцца наконт той жа самай падзеі ў жыцці школы. Трэба таксама падкрэсліць, наколькі істотным будзе паставіць сваё імя і прозвішча пад напісаным артыкулам. Ус гэта дае магчымасць прэзентацыі суб’ектыўных поглядаў.

## КЛОПАТ АБ НАВАКОЛЬНЫМ АСЯРОДДЗІ

Я ўжо падкрэслівала важную ролю фарміравання пачуцця прыналежнасці да грамадства, але не менш важным з'яўляецца пачуццё прыналежнасці да свету, навакольнага асяроддзя, у якім мы жывем. Перад сучаснай асобай паўстае пытанне аб тым, ці клапаціцца аб прыродзе, і як дзейнічаць у мэтах абароны навакольнага асяроддзя ад шкодных наступстваў дзейнасці чалавека.

Тэма экалогіі з'яўляецца ў кожнай школе, але варта клапаціцца аб тым, каб не пакідаць яе толькі на тэарэтычным плане. Нашыя намаганні павінны быць накіраваны на пашырэнне магчымасцяў моладзі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя. Такім чынам, мы можам не толькі фарміраваць дасведчанасць аб небяспецы, але і прапагандаваць штодзённыя паводзіны, якія датычацца клопату аб навакольным асяроддзі.
Адной з ідэй можа стаць распаўсюджванне ведаў аб інстытуцыях, якія займаюцца пытаннямі ўтылізацыі адходаў, у тым ліку небяспечнымі ў лакальнай супольнасці. Многія людзі не валодаюць ведамі, як і з кім звязацца, каб адэкватна абараніць навакольнае асяроддзе ад небяспечных адходаў. Давайце папросім нашых вучняў распрацаваць ўлётку з кантактнымі дадзенымі да адпаведных інстытуцыяў. Яны могуць прыняць форму шпаргалкі, якая будзе падказваць людзям як паступіць. Давайце арганізуем размеркаванне гэтых улётак сярод мясцовых жыхароў. Праз некаторы час вучні будуць здольныя правесці эвалюацыйнае анкетаванне, якое вызначыць, ці гэтая кампанія з’ўлялася эфектыўнай. Любая адзнака можа прывесці да развіцця і апрацавання наступных стратэгій папулярызацыі свядомага кіравання адходамі.
Шмат натхняючых практыкаванняў можна знайсці ў амерыканскім апрацаванні„Education beyond classroom” (http://www.epa.gov/osw/education/teens/pdf/svclearn.pdf)

Мы павінны памятаць, што наша практыка амаль не будзе мець сэнсу, калі сама школа не будзе працаваць у адпаведнасці з наказамі эколагаў. Мы не зможам навучыць вучняў сарціроўцы адходаў, калі школа сама гэтым не займаецца. Наша задача палягае на тым, каб вучні прызвычаіліся да такіх паводзінаў, на стварэнні адпаведных ўмоваў, каб экалагічнае захаванне ператварылася ў звычку. Як я узгадвала раней, моладзь адчувальная да розных фасадных дзеянняў і вельмі хутка пакажа нам, што мы патрабуем таго, чаго не існуе ў нас.

**НЕДАХОПЫ ДЭМАКРАТЫІ**

Вы не можаце прыкідвацца перад вучнямі, што дэмакратыя з'яўляецца ідэальнай сістэмай праўлення. Мы фарміруем у іх крытычныя погляды на рэчаіснасць і павінны даць ім магчымасць парушыць тэму недахопаў і небяспекі дэмакратыі. Мы можам арганізаваць дыскусію, адпраўной кропкай якой стане меркаванне Лукаша Полінцэуша з Інстытуту Палітычных Даследаванняў.

*Наступствы надаюць ідэі дэмакратыі межы і прынцыпы , але, на жаль, таксама існуе магчымасць іх пераўтварэння, у тым ліку і перакрыўленне асноўных думак. Прынцыпы, якія павінны быць створаны для ўсіх і павінны быць зразумелыя для ўсіх ідэнтычна, набіраюць індывідуальны характар і апранаюць маскі - пад якімі ляжаць непажаданыя асаблівасці дэмакратыі. У адваротным выпадку можна весці гаворку аб "спячай" дэмакратыі, аб вялікай сіле, якая, калі выбухае, то дае новае дыханне грамадзянам.*

*5 сакавіка 1933 года адбыўся даволі ўражлівы феномен у гісторыі дэмакратыі. Грамадзяне Веймарскай Германіі даведаліся, што Платон - першы вялікі крытык людзей - лічыў непазбежным наступнае: ў выніку свабодных выбараў да ўлады прыйшла нацысцкая партыя, лідэр якой быў сапраўдным тыраамн. 1989 год прынёс тое, што Платон не ўлічыў - на гэты раз эвалюцыя рэжыму пайшла ў процілеглым кірунку. Хоць працэс дэмакратызацыі праходзіць складана і не без застояў, большасць людзей і маладых дэмакратаў не можа сабе ўявіць, што прыйдзецца вярнуцца да старой сістэмы, а ў краінах з даўнімі дэмакратычнымі магчымасцямі іншая форма кіравання не бярэцца нават пад увагу.*

*Лідэр афінскай дэмакратыі Перыкл, у сваім знакамітым панегерыку ў гонар ахвяраў Пелапанэзкай вайны сказаў: "Вы з'яўляецеся адзіным народ, які не разглядае асобу,якая не цікавіцца дзяржаўным жыццём як пасіўную асобу." Актыўная грамадзянская пазіцыя з'яўляецца не толькі неабходнай умовай для дэмакратыі, але самой сутнасцю гэтай палітычнай сістэмы. Яе нельга абмяжоўваць толькі да паняцця яўкі выбаршчыкаў, хоць яна і разглядаецца як асноўны паказчык заангажаванасці грамадзян. Многія з тых, хто не галасуе, даюць "арыфметычную" падставу сваёй адсутнасці каля скрыні для галасавання. Які ўплыў аказвае на выбар ўраду гэты голас асобнага грамадзяніна?*

*Тым не менш, тое, што падаецца рацыянальным з пункту гледжання асобнага грамадзяніна, можа супярэчыць прынцыпам працы дэмакратычнай краіны. Пасіўны грамадзянін, як безбілетны пасажыр, у выніку, не хоча адмаўляцца ад дабрабыту*

*дэмакратыі. Ён хоча карыстацца правамі, якія дзяржава яму гарантуе, найбольш істотнымі з якіх з'яўляюцца - права на выбар ўрада, і, такім чынам, у пэўным сэнсе, ён думае пра сябе - што ўяўляецца яму хутчэй як выдумка, чым нейкі абавязак. Аднак, ён не ўсведамляе сабе таго, што сама магчымасць фінансавання дэмакратычнай дзяржавы залежыць ад актыўнасці кожнага грамадзяніна.*

*Рызыкі для дэмакратычнай дзяржавы па-ранейшаму выходзяць са шматлікіх крыніц. Яны знаходзяцца ў асноўным у самой прыродзе паходжання дэмакратычнай сістэмы. З'яўляюцца таксама і ў неспрыяльнай міжнароднай сітуацыі, калі дзяржава ўдзельнічае ў пастаянным канфлікце або ўцягнута ў спрэчкі са сваімі суседзямі. Але не толькі адносіны з іншымі краінамі з'яўляюцца патэнцыйнымі знешнімі крыніцамі паслаблення дэмакратыі. Асаблівае значэнне для дэмакратыі маюць эканамічныя крызісы, наступствы якіх грамадства адчувае адразу і не мае дастаткова часу, каб звярнуцца за дапамогай да інстытуцыяў. Так было падчас Вялікай дэпрэсіі трыццатых гадоў, што значна палегчыла прыход Гітлера да ўлады, а таксама ў перыяд эканамічнага спаду сямідзесятых, які стварыў абстаноўку нявызначанасці і спрыяў актывізацыі тэрарыстычных груповак*[3].

Вучням не трэба даваць лёгкіх адказаў. Мы павінны заангажаваць іх да мыслення, бо свядомая сацыяльная асоба вымагае рэфлексіі на тэму як плюсаў так і мінусаў дэмакратычнага ўстрою краіны.

**АБАГУЛЬНЕННЕ**

Фарміраванне грамадзянскай кампетэнцыі вучняў будзе мець большы эфект , калі мы будзем больш засяроджваць увагу на актывізацыі нашых вучняў. Мы можам праводзіць бясконцую колькасць заняткаў на гэтую тэму , але толькі асабісты ўдзел і вопыт у будучыні дазволіць ім у поўнай меры рэалізаваць сацыяльнае стаўленне і ўдзельнічаць у жыцці розных супольнасцей.
Школы павінны рабіць акцэнт на дзеянні. Нам залежыць на тым , каб мы маглі сказаць: "нашы вучні прэзентуюць сацыяльную постаць" замест аб'явы: "нашы вучні ведаюць , як паводзіць сябе , як члена сацыяльнай супольнасці. Дэмакратыя не мае ніякіх шанцаў выжыць без заангажаванасці грамадзян.
Як я ўжо ўгадвала, ўсе прынцыпы , які мы хочаш навучыць, павінны быць адлюстраваны ў функцыянаванні школы. У адваротным выпадку , мы ператворымся ў ненадзейных.
Мы таксама павінны памятаць, што паняцце грамадзяніна з'ўляецца паняццем дынамічным. Немагчыма вызначыць раз і назаўжды грамадзянскую кампетэнцыю.

[3] Łukasz Polinceusz, *Idea demokracji: wady i zalety*, www.ibap.pl



Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.

Замест гэтага мы можам назіраць за грамадствам і спрыяць развіццю карысных прынцыпаў у дадзеным моманце для дадзенай групы.

Апрацавала: Агата Кажушак

*Публікацыя выражае толькі погляды аўтара і не можа быць ідэнтыфікаванай з афіцыйным становішчам Міністэрства Замежных Справаў Рэспублікі Польшчы.*

80-842 Gdańsk, ul. Osiek 11/12, tel./fax (58) 305-80-60, 305-80-61, www.gfo.pl gfo@gfo.pl

Projekt współfinansowany przez Departament Dyplomacji Publicznej i Kulturalnej Ministerstwa Spraw Zagranicznych w ramach konkursu *Wspólne działania polsko- białoruskie*.